1-45

Цана асобнага нумару 20 гр. | Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 1 | Вільня, Нядзеля 10 Студзеня 1932 г. | Год VIII (XVI)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

27751
Bibljoteka Mokslų Akademija

На Новы 1932 год.

Пачынаем 16-ты год нашага выдавецтва. Праз гэтыя 15 гадоў „Крыніца“ чэсна і адважна змагалася за правы Беларускага народу. Ня былі ёй страшны ніякія напасьці з боку ворагаў адраджэньня беларускай нацыі, не адымала сіл і надзеі ў лепшую будучыню гэрам сьціснутага нашага простага вясковага народу.

Усе напасьці з боку нашых ворагаў пацьвердзілі адно: **што мы стаім на добрай дарозе.** Калі-б яны нас хвалілі, было-б горай. Нават напасьці з боку некаторых беларусаў, адкінуўшых незалежніцкія ідэалы, запэўнілі нас, што наш шлях правільны. Мы праканаяы, што Беларускі народ здабудзе для сябе лепшую долю ня ў выслугах прад сільнымі гэтага сьвету, але апіраючыся толькі на свае ўласныя сілы.

Праца наша праз гэтыя 15 гадоў была скіравана да стварэньня беларускай сьвядомай масы. Людзі, якія ўважна сачылі за нашай працай маглі праканацца, што „Крыніца“ праз першыя гады свайго існаваньня йшла ў народ, усьведамляючы яго. Гэта была пара **ўсьведамленьня**. Ад часу стварэньня „Грамады“ і пачатку партыйнай дыфэрэнцыяцыі ў беларускім народзе пачынаецца праца **арганізацыйная**, распрацоўваецца новая праграма Б.Х.Д. склікаюцца тры вялікія зьезды (1926, 1927, 1928 г.). Ад 1928 году мы ўвайшлі ў перыяд **змаганьня**.

Вядамая забарона Віленскага каталіцкага арцыб. Ялбжыкоўскага чытаць каталіком „Б Крыніцу“ і належаць да Б.Х.Д. прымусіла нас баравіць беларусаў-каталікоў прад полёнізацыйнымі натугамі польскага духавенства, якое выступіла рашуча і афіцыяльна проціў нас. Змаганьне з полёнізацыйнымі натугамі польскага духавенства мы ўважаем за наш сьвяты абавязак і за нашу гістарычную місію; але заяўляем, што нам гэта змаганьне накінута.

Апроч змаганьня мы вядзём і працу.

Тая часьць нашага народу, пасярод каторай „Крыніца“ вяла прадусім сваю работу, г. зн. беларусы-каталікі, была і ёсьць бадай найтруднейшым загонам на беларускай ніве. Гэтая частка нашага народу была нагэтулькі моцна засонена ўплывамі польскай рэлігійнай культуры, што многія былі праканаяы, быццам беларусы-каталікі ўжо не прачнуцца. Але гэты сон ужо праходзіць і бачым, што беларусы-каталікі, не адкідаючы сваей веры, пазнаюць самі сябе і прыходзяць да народнага ўсьведамленьня.

Але ня толькі беларусы каталікі даходзяць да народнага ўсьведамленьня: яшчэ ў большай меры да яго даходзяць і беларусы-праваслаўныя. Увесь беларускі народ дружна пачаў ісьці да здабыцьця для сябе належных правоў у школьніцтве, у самаўрадзе, у рэлігійным жыцьці, а асабліва ў зямельнай і падаткавай справе. Але кожны разумее, што да гэтых мэт можна дайсьці не распыленай, але зарганізаванай масай, тымболей, што труднасьцяў і перашкодаў на дарозе вельмі многа. Затым мы будзем арганізаваць беларускія масы пад хрысьціянска-дэмократычным сьцягам.

Будзем так-жа далей змагацца з усялякай крыўдай і несправядлівасьцяй. Так ужо ўстроены гэты сьвет, што без змаганьня нічога ані паасобны чалавек, ані народ не здабывае. Усюды патрэбна змаганьне, дык змаганьня за свае правы баяцца няма што, яго трэба правесьці да аканчальнай перамогі. Але да змаганьня патрэбны дзьве рэчы: сьвядомасьць сваіх правоў і моц і стойкасьць. Пры сьвядомасьці народнай і стойкасьці мы пераможам усе злыбяды. Апошні зьезд БХД 13.XII 31 г. паказаў, што наш народ ужо можа бараніць самога сябе.

Дык да большага ўсьведамленьня народных масаў, да арганізацыі пад сьцягам Б. Х. Д. і да стойкасьці ў змаганьні — гэта будуць нашы клічы на новы 1932 год.

Каля беларусізацыі Царквы.

Справа беларусізацыі Царквы-Касьцёла на беларускіх землях ёсьць справай рэлігійнага жыцьця сяньняшніх дзён у нашым краю.

Аб гэтым гаворыць сяньня кожны сьвядомы беларус, беларускі інтэлігент народнік, кожны беларускі дзеяч і кожны беларускі грамадзкі працаўнік. Гэтага дамагаецца беларуская народніцкая і рэлігійная прэса, гэтага дамагаецца ўсё арганізаванае беларускае грамадзянства.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што беларускі народ, у падарожы да поўнага свайго адраджэньня, імкнецца і да самастойнага рэлігійнага жыцьця. Гэта, як відаць, зразумелі і „дзяльцы“ — „камісіянэры з рынку пасярэдніцтва“ беларускімі справамі, кланіўшыяся сьпярша ў бок сымбалю молата з сярпом, а цяпер у бок беларуска-польскага аб'яднаньня, бо і яны, засноваўшы спэцыяльны орган друкаванага слова для рэлігійнага жыцьця, пасісываюць у ім аб патрэбах беларусаў у рэлігійным жыцьці і аб патрэбе беларусізацыі Царквы на нашых землях.

Знача, разумеюць неабходнасьць беларусізацыі Царквы і тыя, хто з рэлігіяй нічога супольнага ня маюць і змушаны пісісываць аб патрэбах рэлігійных, каб хоць з боку толькі прычапіцца да рэчышча імкненьняў беларускага народу, каб не астацца на абязьлюдзеным рынку свайго бязсорамнага гандлю беларускімі душамі. Не змаглі толькі дагэтуль дакладна зразумець гэтага сучасныя кіраўнікі рэлігійнага жыцьця ў нашым краю. Яны моцна і ўпорыста трымаюцца тае нацыянальнае палітыкі, якая накінута беларускаму народу ў жыцьці рэлігійным бясслаўнай мінуўшчынай. Нашы духоўныя пастыры, быццам вартаўнікі расейшчыны і польшчыны на беларускіх землях, трымаюцца палітычнай традыцыі, якая беларусаў праз праваслаўе русыфікуе, а праз каталіцтва — полёнізуе.

Такая палітыка ў рэлігійным жыцьці нашага краю на руку толькі тым, хто хацеў-бы бачыць беларускі народ пад знакам молата з сярпом, або пад сымбалям кельні — поўнага бязверра і тым, хто ня хоча відзець беларускага народу як нацыю. Але народ беларускі сваей стойкасьцяй веры хрысьціянскай, любасьцяй да ўсяго свайго, што ёсьць беларускае і ўрэшце сілай народнага беларускага духу паказаў, што ён не адступіць ад веры Хрыстовай і не пазволіць заспаіць на сьмерць свайго беларускага „я“.

Аб гэтым сьведчаць беларускія арганізацыі характару рэлігійнага і грамадзка-палітычнага, якія, рэпрэзэнтуючы беларускія масы, дамагаюцца належных правоў для беларусаў як у жыцьці народна-палітычным, так і ў жыцьці рэлігійным. Аб гэтым сьведчыць так-жа і той факт, што і падвойнай народнасьці (беларускай і польскай) гандляры беларускімі душамі, якія таргуюць беларускім сумленьнем, „прымазаліся“ да рэлігійнага жыцьця, каб змагчы ўлезьці ў беларускі агародак.

Вось пад гэтым напорам беларускай народнай сьвядомасьці і сьвядомасьці патрэбаў рэлігійных, як даведваемся, праваслаўныя іерархі пачынаюць абдумываць спосабы направы крыўды беларускаму народу, падыходзячы да справы беларусізацыі праваслаўнай Царквы на беларускіх землях. Але гэта толькі чуткі, бо афіцыяльных даных аб беларусізацыі Царквы мы яшчэ ня маем. Як гэная справа праявіцца на дзеле і ці хопіць у сучасных кіраўнікоў праваслаўнай Царквы на нашых землях сапраўднай хрысьціянскай адвагі стануць поплеч з сярмяжным беларусам у барацьбе за правы Хрыста — пакажа будучыня.

Адно толькі пакульшто можам сьцьвердзіць, што беларускі рух у кірунку аздараўленьня рэлігійнага жыцьця ўжо крэпкі і спыніць яго ня зможа ніякая сіла. А гэта ёсьць нашай зарукай, што гэная духовая моц нашага Народу правядзе і беларусізацыю Царквы.

Н. Я.

З газэт.

Дзеляць.

Польская „Gazeta Poranna“, якая выходзіць у Львове, піша, што на Палесьсі Польшча мае дзьве мэты: мэліорацыйную і нацыянальную. Праводзячы мэліорацыйную палітыку, Польшч можа на асушаных балотах пасадзіць польскіх калявістаў, а праводзячы нацыянальную палітыку, павінна аддзяліць Палесьсе ад варожых для дзяржавы ўплываў, г. зн. ад нацыяналістычнай беларускай прапаганды, якая ідзе з поўначы і ад украінскай — з паўдня...

Аб тым, што польская палітыка хоча загнаць у Палесьсі клін паміж беларусамі і ўкраінцамі, мы ўжо няраз пісалі; толькі, ці ей гэта ўдасца, божыцьцё сільнейшае за ўсе палітычныя пляны, твораныя проціў гэтага жыцьця.

Дайсьці да народу не ўдаецца.

Апошнімі гадамі нашу вёску закідаюць усякага роду нібы каталіцкімі газэтамі, як „Nasz Przyjaciel“, „Głos Wileński“, а каля Горадні „Nowe Życie“, але ўсе стараньні польскіх дзеячоў дайсьці да душы нашага народу астаюцца без рэзультату. Ніхто гэтым газэтам ня верыць; браць то іх яшчэ бяруць, бо папера заўсёды спатрэбіцца, нават часам для цікавасьці чытаюць, але каб гэтыя газэты мелі які ўплыў на народ, каб за імі хто ішоў з праканаяньня — то мы гэтага ня скажам. Даходзяць да нас весткі, што гэтыя газэты, раздаваныя духавенствам, людзі ўважаюць таксама за чужыя, як і само такое духавенства. Апроч гэтага не ўважаюць людзі іх нават за каталіцкія, бо відзяць, колькі там палітыкі, няпраўды і хітрага падходу да народнай душы беларуса. — Так, паны, каня то яшчэ можна злавіць з пустым сітам, як гэта кажуць „кося, кося — ды ў аглоблі“, але і то не заўсёды. Але з народам трудней: ён ужо адрожнівае зярнё ад мякіны. —с.

Грамадзяне!

Прысылайце весткі як у Вас адбылася перапісь насельніцтва, асабліва як запісывалі сьпісовыя камісары беларусам бацькаўскую мову („język ojczysty“) — *—БЕЛАРУСКУЮ, ці якую іншую.*

РЭДАКЦЫЯ.

126018

З беларускага жыцьця

З Наваградзкай бел. гімназіі. Даведваемся, што некалькі тыдняў таму польскія ўлады звольнілі з становішча вучыцеля ў гімназіі грам. Алекс. Даніле́віча, старога бел. дзеяча. Зашто грам. Даніле́віч звольнены і перанесены ў „стан спачынку", — пакульшто няведама.

З жыцьця Б.І.Г.іК. Стараньнем Цэнтр. Управы БІГіК былі саргані́заваны дзьве публічныя папулярныя лекцыі аб гаспадарчай коопэрацыі: ў вв. Вялікай Вёэцы—26 м. м. і Лакцянах — 27 м. м. Сьвянцянскага пав. Лекцыі прачытаў віцэ-старшыня Ц.У.—Б І Г. і К. інж. Клімовіч.

З беларускае выдавецкае нівы. Апошнім часам вышлі з друку і прадаюцца ўва ўсіх беларускіх кнігарнях:

„*Нёман*" літэратурна-мастац а- навуковы месячнік, на месяц студзень 1932 г., кніжка 1., багатага і цікавага зьместу. Рэдактар гэтага месячніка Пётра Сяргіевіч, выдавец—Адвард Будзька.

Адрэс рэдакцыі — Вільня, Кальварыйская 53—2. Падпіска на год — 7 зл., на паўгоду — 4 зл., на 3 месяцы—2 зл. 25 гр., адна кніжка —1 зл.

Да ацэны гэнай новай часопісі яшчэ вернемся.

Беларускі календар на 1932 г. кніжка. Выданьне „Бел. Рэл.—Грам. Саюзу". Фармат гэтага календара 8°, — 96 бачын друку, календорыюм: — царкоўнае і касьцельнае з гаспадарчымі парадамі. Зьмест народна-рэлігійна-грамадзкі. Прадаецца у кнігарнях па 50 гр.

„*Рэлігійнае жыцьцё на Беларусі*". Выданьне. „Бел Рэл.-Грам. Саюзу". Фармат 8°, — бачын 64. Зьмест цікавы.

Галоўны склад гэтай кніжкі, а так-жа і Бэл. календара-кніжкі на 1932 г. — „Pahonia" — Вільня, Людвісарская 1.

„*Z Rodnaha Zahonu*", зборнік вершаў А. Зязюлі. Фармат 8°, бач. 176

„*Новы запавет і псальмы*", фармат малая 8° бач. 446, выд. Брыт. Замежн. Бібл. Т-ва (мэтадыстаўскае).

Сэсія Галоўнай Рады Цэнтрасаюзу. Дня 27.XII.1931. адбылася ў Вільні сэсія „Галоўнай Рады" полёнофільскага „Цэнтрасаюзу". На гэту сэсію зышліся віленскія сябры Цэнтрасаюзу — Антон Луцкевіч, А. Трэпка, Р. Астроўскі, каля 5 асоб іншых, прадстаўнікі „слаўнай" студэнскай корпарацыі „Scorinia" і нараджаліся, што рабіць далей.

На нарады полёнсфільскага „Цэнтрасаюзу" з беларускай правінцыі ніхто ня прыбыў, за вынняткам дырэктара Наваградзкай бел. гімназіі, грэм. Цеханоўскага. Але і гэты адзіны прадстаўнік з беларускай правінцыі заявіў на сэсіі, што ён прыбыў на нарады „Цэнтрасаюзу" толькі як госьць. Пры гэтым дырэктар Цеханоўскі паясьніў, што ані Дырэкцыя Наваградзкай беларускай гімназіі, ані Бацькаўскі камітэт гэтай гімназіі прыймаць учасьця ў нарадах „Цэнтрасаюзу" ня могуць, бо ўлады апошняга не падаюць да ведама аб сваей працы і што бюджэт „Цэнтрасаюзу" нейкі „дзіўны".

З справаздачы аб дзейнасьці „Цэнтрасаюзу" за мінулы час даведваемся, чаму паўстаў „Цэнтрасаюз", аб яго заданьнях, аб гутарках уладаў „Цэнтрасаюзу" ў асобе грам. Астроўскага з прадстаўнікамі „Бесп. Блёку Супрац. з Урадам", аб тым, што няма яшчэ вынікаў працы „Цэнтрасаюзу", бо быццам польскі ўрад не распрацаваў яшчэ „беларускае праграмы" і што „Цэнтрасаюз" пастанавіў (ужо ў пачатку 1932 г.) „распачаць хоць у вузкіх межах выдавецкую працу". Апрача гэтага, даведваемся, што „Цэнтрасаюз" у мінулым годзе меў бюджэт аж на 96 тысяч злотых і гэтыя грошы ўсе расходаваны і што коштам гэтага ж бюджэту выдана толькі кніжачка „Мышанё Пік" 65 бачын друку, фармату 16°, якая каштавала аж 800 зл.

Як бачым, дарагое гэнае „мышанё", мусіць нейкае заморскае!...

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

Процiў беларусізацыі. За апошні час у Гомелі меў месца рад адкрытых вылазак вялікадзяржаўных шавіністаў. Так, студэнты сап. парт. школы, партыйцы Рыбакоў і Дрыбяза катэгарычна адмовіліся вучыцца бел. мовы, заяўляючы, што „бел. мова калечыць людзей." Тэхнік Журэўлёў, член КП(б)Б. і камсамолец Барысенка на адным з масавых сходаў патрэбавалі ад дакладчыка, каб ён гаварыў у расейскай мове, кажучы: „гаварэце толькі не ў заграмічнай мове. Вы дзе ў другім месцы гаварэце пабеларуску, а з намі — парасейску." Член КП(б)Б. Пугачоў кажа „не хачу чытаць „Палескую праўду," бо яна ў кітайскай мове."

Амаль ва ўсіх установах бел. мова лічыцца абавязкавай толькі для машыністак, бо яны павінны перакладаць усю перапіску з расейскай на беларускую мову."

„Работа па беларусізацыі апарату ў Магілёўскім раёне праводзіцца вельмі слаба. Амаль ва ўсіх савецкіх і партыйных установах працаўнікі гавораць толькі ў расейскай мове. Нават у палітінстытуце беларуская мова ігнаруецца. Студэнты ў штодзенным жыцьці вядуць гутарку заўсёды парасейску.

Гэтак сама стаіць справа ў Жлобінскім раёне і Віцебску. („Сав. Бел." 23.XI. 31).

Полацак. „У саўгасе „Баноўь-Бязьдзедавічы" пануе абязьлічка ў гадаваньні і кармленьні сьвіньней. Сьвіньні па цэлых сутках ня кормяцца, корм папрыхтоўвуецца зусім дрэнны. Асобы, якія-б адказвалі за сьвіньней, ня вылучаны.

У выніку панаваньня абязьлічкі процант адыходу парасят у саўгасах нязвычайна вялікі. Па ўсім саўгасе процант адыходу быў 41, а па Баноні—87 проц. Як бачым, галаваццы з вучастку саўгасу „Банонь" занялі першае месца па бязьлітасным зьнішчэньні парасят" („Сав. Бел." 23.XI.31).

БЕЛАРУСЫ Ў ЧЭХАСЛАВАЧЧЫНЕ.

Беларуская прамоцыя. Даведваемся, што ў панядзелак 21.XII. м. г. ва чэскім унівэрсытэце ў Празе (ЧСР) быў прамаваны на дохтара ўсіх лекарскіх навук (MUD-r) грам. Алесь Вітушка, беларус, родам з Нясьвіжа. — Шчыра віншуем!

Д р А. Вітушка на днях вяртаецца з заграніцы на Беларусь.

Закрыцьце ў Віленшчыне польскімі ўладамі 10-цёх літоўскіх пачатковых прыватных школ.

31 сьнежня 1931 г. Куратар Віленскага школьнага вокругу закрыў 10 літоўскіх пачатковых школ, якія ўтрымлівала літоўскае культурна-прасьветнае Т-ва „Рытас," у наступных мясцовасьцях: у Міцюнах, Гемонах і Канюхох—пав. Віл.-Троцкага, у Зуйках пав. Сьвянцянскага, у Пелясах, Дубічах і Павалоцы—пав. Лідзкага, у Білях пав. Ашмянскага, у Бенюнах пав. Браслаўскага і адну школу ў Вільні.

Такім чынам пазбаўлены роднай школы 360 літоўскіх дзяцей і пазбаўлена пасады 12 вучыцялёў, большасьць якіх мае вучыцельскія кваліфікацыі.

Зачыняючы ўспомненыя прыватныя літоўскія школы, польскія ўлады загадалі ўсе школьныя архівы перадаць польскім інспэктарам да дня 4.I.1932 г.

Пазбаўленыя роднай школы дзеці будуць пасылацца ў бліжэйшыя польскія школы.

Ад тлумачэньня гэтага здарэньня ўстрымліваемся. Факт гэты вымоўна гавора сам за сябе.

З прычыны такога цяжкога ўдару па літоўскай школе, мы беларусы, якія самі перажываем школьную трагедыю, літоўскаму грамадзянству і народу выражаем наш шчыры спагад...

Ад. Клімовіч:

І культура і палітыка. 1)

(Рэфэрат прачытаны на Зьезьдзе БХД 13.XII.1931 году).

„...нам патрэбна і свая культура і свая беларуская палітыка" („Бел. Крын." №6-31).

I.

Мы жывём сяньня ў такіх часах, калі аб культуры і аб палітыцы гаворыцца вельмі і вельмі шмат. Адны кажуць, што трэба больш працы культурнай, іншыя, — што ўсё залежа ад палітыкі, яшчэ іншыя, — што патрэбна нам і свая культура і свая беларуская палітыка. Гэтак між іншым высказалася блізу год таму назад і наша „Бел. Крыніца". Якое-ж становішча да гэтай справы заняць нам, што сабраліся на сяньняшні *палітычны* сход? Каб даць адказ на гэта пытаньне, мусім застанавіцца над тым, што сапраўды азначае слова „культура" і што — „палітыка".

Як адно так і другое азначае пэўную *чыннасьць*, якая кіруецца паводле тэй мэты, каторую выткнуў сабе чалавек. А знача *ўсё залежала-б ад мэты*, як аб гэтым сказаў ужо паганскі *Цыцэрон*. Але для нас, што стаім пад сьцягам ня толькі народным, але і Хрыстовым, для нас *чыннасьці* нашы *залежаць* ад мэты, *але ня могуць быць самамэтай*. Як падвойнай ёсьць для нас мэта жыцьця: *вечная* і *дачасная*, так падвойнай мусіць быць і мэта людзкой чыннасьці. Мэтай *культуры*, паводле гэтага, павінна быць *моральная выпраўка душы і ўлада над цэлай прыродай і над людзкой натурай*.

Як відаць з гэтага, круг дзейнасьці культуры засягае, ці лепш *абымае* ўсю людзкую чыннасьць кругом, як духовую, так і матэр'яльную. Гэта двойчыннасьць культуры паслужыла некаторым вучоным дасьледчыкам за прычыну, каб падзяліць і самае паняцьце культуры ў залежнасьці ад таго, якую чыннасьць гэта культура абымае, на дзьве часьці. Гэтак слаўна ведамы Foerster тэхнічную чыннасьць чалавека, накіраваную да апанаваньне сілаў прыроды і павышэньне ягонага жыцьцёвага роўня (niveau) азначае словам цывілізацыя, а ўласьцівай культурай называе намаганьне чалавечага духа дзеля апанаваньня людзкіх сіл і вытварэньня людзкога сумленьня. Цывілізацыю, як відомы вынік пэўнай чыннасьці, называюць таксама культурай матэр'яльнай, або тэхнічнай — у процівагу культуры ўласьцівай, называнай інакш яшчэ культурай духовай.

II.

Не зважаючы на гэты тэорэтычны падзел, практычна культура і цывілізацыя твораць адну цэласьць, бо адно вынікае з другога і ўзаемна дапаўняецца. Культура духовая—старэйшая ад культуры матэр'яльнай, тэхнічнай і для гэтай апошняй да нашых дзён зьяўляецца бяздоннай крыніцай, без каторай, раней ці пазьней, засыхае. Доказам гэтага ёсьць лёс пышнай на свой час культуры старога Бабілёну і Асырыі. Культура гэтай старонкі, на тысячу гадоў прад Хрыстом, мела ўсе прыметы матэр'яльнай культуры нашых дзён, мела высокую тэхніку земляробства і гандлю, мела банковую сыстэму, мела высока-разьвітае соцыяльнае законадаўства, протэкцыйную сыстэму гандлёвай палітыкі і г. д. Тое самае бачым у старадаўным Рыме, тое самае — ў Грэцыі. І ад усяго гэтага асталіся сяголеньня толькі руіны, бо ўвесь гэты пышны вытвар людзкога духа быў пастаўлены на сухавеі і пазбаўлены, не для кожнага відомых, але вечна жыцьцядайных крыніцаў праўдзівай духовай культуры.

Знача, для матэр'яльнага дабрабыту і поступу людзкасьці, патрэбна духовая культура. А дзеля таго, што гэту культуру творыць ня хто іншы, як народ, дык і культура ягоная мусіць зьяўляцца ня толькі люстрам, адбіваючым жыцьцё даннага народу, але і вечным дакумэнтам гэтага жыцьця ды найлепшым аружжам дзеля ягонай абароны. Покуль жыве народная культура—жыве і народ.

„Беларуская Крыніца" ў м-цы студзені выйдзе: 17, 24 і 30-га дня.

Маскаленьне Праваслаўнай Дух. Сэмінарыі ў Вільні.

У інтэрнаце гэтае сэмінарыі ёсьць каля 115 сэмінарыстых. Як чуваць, у часе сьпісваньня насяленьня 9.XII.1931 г. ўсе яны падалі расейскую мову як родную і толькі 3 чал. падалі мову беларускую. Як бачым, у Праваслаўнай Сэмінарыі ў Вільні вядзецца цяпер гэткая русыфікацыя, якой ня было нават за царскіх часоў расейскіх. Перад вайной у Праваслаўных сэмінарыях быў беларускі рух і ня мала з паміж сэмінарыстых вышла беларускіх дзеячоў.

„Истинно-русскіе“ кандыдаты.

Як чуваць, рэктар Праваслаўнае Дух. Сэмінарыі ў Вільні падаў школьнай уладзе на зацьверджаньне двух кандыдатаў за ўзгадаваццаў у інтэрнаце Сэмінарыі. Абодва кандыдаты — „истинно-русскіе“ людзі. Як гэта пагадзіць з тым, што як сказана ў „Голасе Прав. Беларуса“, рэктар сэмінарыі ёсьць „вельмі прыхільны да Беларусаў“? Каб ён на'т ня быў прыхільны, а толькі справядлівы, дык пэўна запрапанаваў-бы кандыдатаў сьведамых Беларусаў, або, прынамся, не русыфікатараў.

З украінскага жыцьця.

Толькі двух. Укр. „Студентськiй Шлях“ № 7—8 паведамляе, што на мэдычны факультэт у Львове сёлета прыняты толькі двух студэнтаў-украінцаў, тады калі прошлыя гады прымалі менш-больш па 14—18 чалавек. Затое сёлета прынялі у той-жа унівэрсытэт аж 10 ёх „русскіх“.

Незацьверджаньне Т-ва. У лістападзе 1931 г. быў распрацаваны і пададзены на зацьверджаньне Статут „Укр. Т-ва Міру і Працы на карысьць Лігі Народаў у Польскай Рэспубліцы“, аднак польскія ўлады гэтага Т-ва не зацьвердзілі, матывуючы, што ўжо ёсьць падобнае Т-ва ў Луцку (полёвафільскае). Пры гэтым справядліва адзначае „Діло“, што польскіх падобных Т-ваў існуе аж некалькі ў граніцах Польшчы і гэта ня было на перашкодзе пацьверджаньню іх усіх... Яшчэ адну характэрную адзнаку падае „Діло“: апошні адказ польскімі ўладамі быў дадзены толькі ў польскай мове, тады калі дауней давалі апроч гэтага і ў мове украінскай.

З Польшчы.

Праца Сойму і Сэнату. У панядзелак 11 г. м. соймавая бюджэтная камісія прыступае да разгляду бюджэту мін. загранічных спраў. У аўторак сэнацкая камісія загранічных спраў будзе разважаць над загранічнай палітыкай Польшчы.

Малочны закон. Газэты падаюць, што хутка будзе аб'яўлены закон, якім будуць рэгуляваць абарот малака і малочных вырабаў — масла і сыроў.

Самагубства польскіх афіцэраў. У апошніх часах застрэліліся два польскія афіцэры — кап. Вроўскі і падп. Шчэпавік.

Суд над павадырамі „Цэнтралеву“ ужо зьбліжаецца да канца. Ужо кончыліся прамовы пракурораў і абароны, асталося толькі праслухаць апошняга слова абвінавачаных, каб выдаць прысуд.

З заграніцы.

Манджурскія падзеі і Саветы. Японія ўжо канчае займаць усю Манджурыю. На поўдні яна дайшла да вялікай кітайскай сьцяны, якую працавітыя кітайцы збудавалі дзеля абароны ад манголаў і заняла Чін-Чоў, а на поўначы... усё ціха. Там бадай няма ўжо кітайскага войска, а савецкае — толькі прыглядаецца да ўсяго...

А што далей?

У маскоўскіх палітычных кругох пануе праканаўне, што Японія ня толькі займе ўсю Манджурыю, але сягне яшчэ за Амур па Уладывасток і Уссурыйскі край. Тымболей, што нядаўна сфармаваўся новы японскі ўрад, які складаецца з ваеннай партыі, а ваенная партыя прэ як да найбольшых заваяваньняў. Паміма ўсяго гэтага ў саветах можна опасьцерагчы нейкую дзіўную ціш і супакой. Што-б гэта мела значыць?

Нават тады, калі японцы прыбліжаліся да Усходня-Кітайскай чыгункі, якая лучыць Сібір з Уладывастокам і якая знаходзіцца часткова пад загадамі Саветаў, нават тады Саветы асталіся спакойнымі і ня выслалі ніякага пратэсту. Праўда, тады пачаліся былі мітынгі пратэсту па фабрыках і гарадох, але гэтыя мітынгі былі вельмі баязьлівыя; гаварылі, крычалі, нават выносілі рэзалюцыі, але ўсё рабілася так, каб не абразіць Японіі і не даць ёй прычыны да вайны.

У Маскве вельмі добра знаюць японскую армію, яе арганізацыю, дысцыпліну, тэхніку, так што біцца з імі бальшавіцкая армія ня можа. Камуністы так-жа ведаюць, што пры помачы агітацыі можна разлажыць з-нутра кожную эўрапэйскую армію, але гэтага ня ўдасца зрабіць з арміяй японскай: там пануе нейкая шалёная дысцыпліна, абапёртая ня гэтулькі на страху перад начальствам, колькі на народнай сьведамасьці і патрыятызьме. А йсьці біцца з такой арміяй, гэта тое самае, што скочыць у цёмную пропасьць, у каторай няведама, дзе можна апынуцца.

Уся надзея бальшавікоў на сусьветны гаспадарчы крызыс, каторы можа аслабіць так-жа і Японію і... на магчымую звадку паміж вялікіх дзяржаў за Манджурыю і Кітай. Згэтуль і выцякае той міралюбівы тон савецкіх адказаў на японскія прэтэнсіі датычна помачы, якую саветы быццам падавалі кітайскаму генэралу Ма. Згэтуль плыве і шуканьне аказіі да заключэньня пактаў аб узаемным ненападаньні з усімі заходнімі суседзямі. Забясьпечыўшыся на заходзе, саветы магчымуць большую ўвагу зьвярнуць на ўсход і разам з гэтым будаваць сваё гаспадарчае жыцьцё пры помачы пяцігадовых плянаў.

Пагроза вайны між Японіяй і Амэрыкай. Адначасна з збройным канфліктам японска-кітайскім нарастае такі-ж канфлікт і японска-амэрыканскі.

Нядаўна ў адной француцкай газэце, зьявілася стацьця японскага генэрала Кіо-Катоу—Сото пад загалоўкам „Між Японіяй і Зл. Шт. Амэрыкі вайна немінучая!“

У гэтай стацьці японскі генэрал між іншым піша так:

„Японская раса ўзяла на сябе адказную місію кіраўніцтва лёсам Далёкага Ўсходу. Мы не забываемся аб гэтай місіі, а Зл. Шт. Амэрыкі на другім баку Вялікага Акіяну пачалі весьці палітыку шкодную для нас у імкненьні на азіяцкім кантынэнце. Зл. Шт. Амэрыкі закладаюць свае місыйныя станцыі па ўсім Кітаю. Урадавыя агенты Зл. Шт. Амэрыкі падкопываюць нашы ўплывы.

Наш 70-мільённы народ душыцца на малых вастраўках. Каб забясьпечыць яму існаваньне, нам трэба здабыць новыя землі. А гэтаму перашкаджаюць Зл. Шт. Амэрыкі. Перашкаджаюць сьведама. Вось-жа, хоць мы і ня хочам вайны, у канцы канцоў нас да вайны змусяць. Вайна Японіі з Амэрыкай нязьбежная!“

Японска-амэрыканскія зачэпкі. Апошнія весткі з Далёкага Ўсходу падаюць, што японскія жаўнеры ў Мукдэне цяжка ранілі віцэ-консула Зл. Шт. Паўночнай Амэрыкі, а ў Гоубутсы японскія вайсковыя ўлады арыштавалі вайсковага дыплёмата Зл. Шт. Амэрыкі.

Колькі вінавата Эўропа Амэрыцы? Эўропа ўгінаецца цяпер пад цяжарам вялізарных даўгоў, якія яна нарабіла ў Амэрыцы. Амэрыка, як ведама, пазычыла грошы ўсім вакол у сусьветнай вайне дзяржавам. У канцы аказалася, што амаль усе эўрапэйскія дзяржавы апынуліся па вушы ў даўгох у Амэрыцы, якія перавышаюць іх гаспадарчыя сілы.

Вось як выглядае задаўжэньне эўрапэйскіх дзяржаў у Амэрыцы (сума з працэнтамі ў далярах):

Англія — 4.600 000 000, Аўстрыя — 24.614.885, Бэльгія — 417.780.000, Чэхаславачына — 115 000.000, Эстонія — 13.830.000.

W. A. 1)

Kaniok-Harbuniok.

ČAŠĆ I.

I.

Za dałami, za lasami,
Za šyrokimi marami,
U wadnej chacie, ŭ wadnej wioscy
Žyŭ dziadočak pry darožcy.
Byli ŭ dzieda try synočki:
Rusy wołas, sini wočki;
Staršy samy razumniejšy,
Druhi kryšku tupiejšy,
Treci prosta byŭ bałwan —
Nazywaŭsia jon Iwan.
Staršy imianiem Danila,
A siaredni byŭ Haŭryla;
Treci... my užo kazali,
Usie durnym jaho prazwali:
Byŭ durny jak bot, jak pień —
Adnym słowam, chłopiec dreń.
Braty siejeli pšanicu,
Dy wazili u stalicu;
Musić — to jana była
Niedaloka ad sieła.
Tam pšanicu pradawali,
Mnoha hrošy zarablali:
Uziaŭšy zołata jak droŭ,
Waračalisia damoŭ.
Pośle toha doŭha-skora
Prywaliła k bratom hora:
Niechta ŭnoču staŭ im škodzić —
Pa pšanicy chodzić-brodzić;
Dy taho jašče nia dosić:
Ŭsim pšanicu, šelma, kosić!
Z taho hora braty płačać,
Ad ŝloz mała świetu bačać.
Dy dawaj za rozum braccal
Treba, značyć, dahadacca,
Jak zławić taho złodzieja —
Złydniu, šelmu, lichadzieja?
Adzin brat im radu sulić,
Kab pšanicu karawulić,
Dy kab złodzieja zławić —
Haławu jamu skrucić.

II.

Dobra. Stała woś źmiarkacca,
Staršy brat pačaŭ źbiracca:
Cep i wily ŭziaŭ z saboj
I pašoŭ na strašny boj!
Nočka ciomna nastupiła,
Staŭ bajacca naš Daniła:
Dryžać nohi, lipnuć wočy,
Chodziać strachi sierad nočy.
Woś Daniła, biedny, ŭziaŭ
Celu noč naskroś praspaŭ.
Rana ŭstaŭ, krychu pamyŭsia,
Wadoj pośle cely źliŭsia,
Pryjšoŭ, łomicca u dźwiery:
„Ach wy, sonnyja ciaciery!
Adčyniajcie mnie skarej —
Ja pramok až da kaściej“.
Braty dźwiery adčynili,
Karawulnaha puścili,
I dawaj pytać jaho,
Ci nia bačyŭ jon čaho?
Karawulny pamaliŭsia,
U prawo, ŭ lewa pakłaniŭsia;
Doŭha kašlaŭ i smarkaŭsia —
Dy raskazywać źbiraŭsia.
Pośle kaža niebarak:
„Było dzieła tak i tak:
Celu nočku ja nia spaŭ,
Taho złodzieja čakaŭ.
Noč usia była panura:
Padniałasia strašna bura,
A doždž liŭ jak-by z wiadra —
Nia było tam mnie dabra!
Jak mahłosia, tak płakałosia —
Rešta dobra udałosia“.
Baćka kaža: „Maładziec!
Pieršaj klasy ty chłapiec:
Abawiazak spoŭniŭ wierna —
Heta budzie ŭsim prymierna.
A ja baču z hetaj štuki,
Što ty majstar na ŭsie ruki“.

III.

Nowy dzień pačaŭ źmiarkacca.
Treba sredniamu źbiracca.
Ŭziaŭ jon cep, kasu i wily,
Ŭ ruki plunuŭ z celaj siły...
Prychwaciŭ i nož z saboj
I pašoŭ na strašny boj!
Nočka zimnaja nastała,
Drož jaho apanawała:
Zub na zub nie papadaje.
Woś Haŭryła naš nia znaje,
Što rabić, kudy padziecca?
Pryhałubiŭsia k susiedca...
Tam śmiajališ, žartawali —
Tak pšanicy pilnawali.
Zaŭtra, pośle takoj nočy,
Hladzieŭ śmieła ludziam ŭ wočy;
Dy tak stukaŭsia u dźwiery,
Što nia znaŭ nijakaj miery.
„Hej, piacurniki, ustawajcie!
Skarej dźwiery adčyniajcie,
Bo ad strašnaha marozu
U mianie pad nosam ślozy“.
Braty chutka adčynili,
Karawulnaha puścili;
Pačali pytać jaho,
Ci nia bačyŭ jon čaho?
Tut Haŭryła pamaliŭsia,
U prawa, ŭ lewa pakłaniŭsia;
Hawaryć saŭsim nia choča,
Tolki cichańka barmoča:
„Ja ŭsiu nočańku nia spaŭ,
Dyj pšanicy pilnawaŭ.
A maroz, taki traskučy,
Mianie wielmi pieramučyŭ:
Haława maja traščeła,
Jašče čuju — balić cieła.
Ŭsio spłałosia, jak mahłosia,
Aby tolki udałosia!“
Baćka kaža: „Ty, chłapiec,
Taki samy maładziec!“

(*dalej budzie*).

Фінляндыя — 9.000.000, Францыя — 4.025.000.000, Грэцыя — 18.125.000, Югаславія — 62.850.000, Літва — 6.030.000, Латвія — 5.775.000, Польшча — 178 560.000, Румынія — 44.590.000, Мядзяршчына — 1.939.000, Італія — 2.042.000.000.

Гэтае пералічэньне паказвае, што амаль усе эўрапэйскія дзяржавы апынуліся ў грашовай залежнасьці ад Амэрыкі, якая будзе цяжыць на гэтых дзяржавах праз некалькі пакаленьняў.

Дзеля гэтага эўрапэйскія дзяржавы і дамагаюцца хоць крыху зьмяншэньня гэтых даўгоў, але Амэрыка аб гэтым і слухаць ня хоча.

Амэрыканскі нацыяналізм. У Амэрыцы цяпер адчуваюцца сільныя нацыяналістычныя тэндэнцыі. У Амэрыцы няма ўжо гутаркі аб супрацоўвіцтве з іншымі народамі дзеля ратаваньня сьвету ад пагражаючай гаспадарчай катастрофы. На застрашаючы гаспадарчы крызыс, які нарабіў дэфіцытавых шчарбінаў у амэрыканскім дзяржаўным бюджэце, у амэрыканцаў, чакаючых новых падаткаў, паўстаў кліч „Эўропа заплаціць." Зл. Шт. Амэрыкі цяпер ні аб якіх іншых справах і ня думаюць, як толькі аб даўгох, каб як іх зыскаць ад Эўропы. Амэрыка варочаецца да поўнага аддзяленьня ад Эўропы і горка шкадуе, што пазычыла Эўропе мільярды, якія ў Эўрппе „замерзьлі."

Арышт павадыра індускага народна-вызвольнага руху—Гандзі. У апошнія часы арыштаваны ангельскімі ўладамі ў Індыі павадыр індускага народна-вызвольнага руху—Гандзі. Месяц таму Гандзі быў „гасьцём" у Лёндане на канфэрэнцыі „Круглага стала" з прадстаўнікамі Англіі, якія стараліся наклаціць Гандзія да ўгоды. Але Гандзі на ўгоду не пашоў і, вярнуўшыся ў свой край, выступіў процiў ангельскай палітыкі ў Індыі. Гандзія арыштавалі пасьля яго прамовы да многатысячнага натоўпу аб патрэбах барацьбы з ангельскім вызыскам. Пасьля арышту Гандзія пачаліся ў Індыі забастоўкі ў знак пратэсту.

Ab haspadarcy. (1)

Jak abchodzicca z miasam?

Dzień prad zabićciom žyvioły treba davać jej tolki vadu. Pry samym zabivańni lepš padrazać žyviole horła, čymsia traplać u serca, asabliva ŭ śvińni. Kab kroŭ zabivanaj žyvioły była pa mahčymaści daŭžej pryhodna da spažyćcia, jaje źbirajuć u čystaje načyńnie, solać, časta dadajuć krychu octu i staranna vymiešyvajuć. Šerść z zakołatych śviniej treba vyryvać, pakul zabitaja štuka jšče ciopłaja.

Kab miasa chutka nie psavałasia, jaho marynujuć, kopciać (vendziać), a niaraz — adno i druhoje.

Da marynavańnia ŭžyvajuć miešaniny soli, saletry, cukru, piercu, babkovaha listu, cynamonu, jałaŭcovych jahad, čyrvonych i biełych burakoŭ i inšych prypravaŭ. Na 100 častak soli biarecca 2 4 častki saletry, pa hetulki ž bolš-mienš inšych prypravaŭ i 6 častak cukru. Saletra ŭžyvajecca na toje, kab miasa nabyło pryhožaha čyrvonaha koleru i zrabiłasia tuhim. Cukru dadajecca, kab źvialičyłasia tryvałkaść miasa.

Mnostva soli ŭžyvanaj da marynavańnia miasa zaleža ad taho, za jak doŭha maje być miasa spažyvanym: čym chutčej, tym mienš dajecca soli U siarednim na 25 kg miasa dajecca 1 kg soli.

Zadańniem soli pry marynavańni miasa, miž inšym, jość adciahivać z miasa nadmiernuju vohkaść. Da hetaha patrebna suchaja sol i tamu prad užyvańniem jaje na patelni proci połymia padsušyvajuć tak doŭha, až pokul nie pačnie treskać, a pry pierasypańni — šuścieć.

Miasa da marynavańnia treba pryhataŭlać užo zrazu pry „raźbirańni": za ciapła jšče jaho nacirajuć małoj kolkaściu cukru i časnaku. Samaje marynavańnie pravodzicca bolš-mienš hetak: biarecca zahadzia pryhatavanaje čystaje, ničym niepachnučaje načyńnie, napr. načoŭka, cebar, bačonak i pasypajecca z siaredziny pakryšanym babkovym listom, jałaŭcovymi jahadami i h. d. Pryhatavany kusok miasa mocna nacirajecca miešaninaj saletry z cukram, a paśla padsušanaj sollu i ŭkładajecca ciesna kusok pry kusku. Paasobnyja kuski miasa pierakładajucca tymi-ž pachučymi dadatkami. Pry kaściach robiać časam nožam ščeliny, u katoryja paśla zasypajuć saletru i sol.

Nałožanaje miasa nakryvajuć čystym denkam i prycisłajuć takimi-ž kamieńniami. Pakul hetak nałožanaje miasa nia puścić sok (pryblizna praz 3 dni), jano trymajecca ŭ ciopłym pamiaščeńni i štodnia pieravaračyvajecca, kab marynavałasia roŭnamierna. Paśla sudzina z miasam vynosicca ŭ zimniejšaje pamiaščeńnie, prytym mahčymy niedastatak soku dapaŭniajecca astudžanym rastvoram soli ŭ pieravaranaj vadzie.

Jak doŭha marynujecca (lažyć u sosie) miasa, zaleža jakoje heta miasa i ŭ jakuju paru hodu marynavańnie adbyvajecca. Miasa z maładoj žyvioły chutčej u sosie dazravaje, ale chutčej paśla i psujecca. Kumpiaki zvyčajna nie pavinny daŭžej marynavacca, jak dva tydni, a paśla, absušanyja, vendziacca. Karoviaje miasa z štuk maładziejšych 5—6 hadoŭ lepš nie marynavać.

Urešcie treba zaznačyć, što da marynavańnia pryhodna tolki miasa śviežaje. Letam marynavańnie ciahniecca daŭžej, čymsia ŭzimku. Taksama bolšyja kuski miasa marynujucca daŭžej, čymsia kuski małyja.

inž. A. K.

Да нас пішуць.

АБ ПЕРАПІСІ НАСЕЛЬНІЦТВА.

в. Запольле, Косаўскага пав. Як ведама, 9 сьнежня 1931 г. адбылася ўва ўсей Польшчы агульная перапісь насельніцтва. Дык вось я хачу напісаць хоць трохі, як у нас запісывалі бацькаўскую мову (ензык ойчысты).

У нашай вёсцы ўсе жыхары падавалі, што іх мова бацькаўская —мова беларуская.

Спачатку сьпісовыя камісары запісывалі так, як адказывалі на пытаньне запісываныя, а пасьля пачалі тлумачыць пасвоему. На адказ селяніна, што яго бацькаўская мова беларуская, камісар сьпісовы тлумачыў, што гэта мова мяйсцовая і так запісываў. Калі-ж сяляне спрацівіліся запісі мовы беларускай нейкай „мяйсцовай," сьпісоўшчык заявіў, што гэтак запісываць беларускую мову казаў яму яговы кіраўнік.

Не зважаючы на гэткае перахрышчываньне беларускай мовы на мову „мяйсцовую," многія сяляне спрацівіліся гэтаму і патрэбавалі запісываць ім бацькаўскую мову беларускую.

Камісарамі сьпісовымі былі ў нас адны палякі: польскія вучыцялі і польскія асаднікі. Былі паданы кандыдаты на камісараў сьпісовых і беларусы, але перапісь у нас абышлася бяз сьпісоўшчыкаў беларусаў.

Ш. М.

„МОЙ ЯЗЫК ЧЫСТЫ" І ІНШЫЯ НЕДАРЭЧНАСЬЦІ.

в. Баяры, Нясьвіскага пав. Цяжкое гаспадарчае палажэньне змушае нашых сялян прадаваць скаціну, каб заплаціць нават дробны падатак. Да гэтай бяды далучаецца часта і свая недарэчнасьць, асабліва, калі селянін залье „весялухай" сваё гора, а тады паўстае ў сялянскай хаце сапраўднае спусташэньне.

Надовячы аднаму нашаму селяніну прышлося на падаткі браць апошняга парсючка. Прадаўшы, селянін задумаў „павесяліць" сваё гора — выпіў з нядобрым кумпанам паўкварты і запяяў, перакручваючы словы, „ешчэ Польска не згінэла..." За такі сьпеў паліцыя сьпісала пратакол і цяпер гэтаму селяніну трэба хадзіць у пастарунак паліцыі два разы на тыдзень мэльдавацца, пакуль суд ды дзела.

У часе перапісі насельніцтва, нашы людзі заяўлялі, што іх бацькаўская мова беларуская. Многія не разумелі польскага пытаньня „ензык ойчысты." У аднаго селяніна сьпісовы камісар запытаўся „які маш ензык ойчысты"? а селянін яму адказаў: „паночку, мой язык чысты, далібог чысты! вугроў няма на языцэ"—і высалапіў язык, каб паказаць камісару. Тады камісар перамяніў пытаньне і запытаў, „як гаворыш?"—Гавару я па свойму — пабеларуску, адказаў тады селянін. Не спадабаўся мусіць камісару такі адказ, бо ён штосьці забарматаў і прамовіў: „Хора стара, ютро умжэ, а дзісь пішысень беларусам." Да чаго гэтыя апошнія словы камісара тасуюцца—нямаведама. Мусіць гэта звычайная недарэчнасьць і больш нічога.

А. В.

АБ НАШАЙ МОЛАДЗІ І ПЕРАПІСІ.

Трабы, Валожынскага пав. Няма ў нас і каля нас беларускіх арганізацыяў. Мястэчковая моладзь і з блізкіх вёсак ад мястэчка пазапісываўшыся ў „Стшэльцы." Уся моладзь наша, як і старэйшыя, гавораць між сабою толькі пабеларуску і пяюць беларускія песьні. Духу польскага ў нашай моладзі ня чуваць. Наша моладзь ня мае добрага прыкладу і дзічэе. Стралецкія „кулкі" ня робяць з нашай моладзі ані палякоў, ані добрых беларусаў. Вот расьце моладзь у стралецкіх „кулках" на лес гледзячы і больш нічога. Адно толькі, што хлапчук — стралец чуецца адважным і яму мора па калена.

Гэтая адвага нашых хлапчукоў 14 XII. 1931 г. праявілася вельмі прыкра. А гэта было вечарам. Варочаўся скульсьці дамоў на фурманцы мяйсцовы ксёндз. Адважныя хлапчукі накамячылі сьнежак і давай цаляць у яго. Ксяндза „адважныя" хлапчукі засыпалі сьнежкамі і зьбілі з носу акуляры. Ксёндз ад „адважных" хлапчукоў мусіў бараніцца рэвальвэрам, страляючы ўгару на пастрах. Аб гэтым усім ксёндз заявіў у паліцыю, якая шукае вінаватых. Але ці знойдзе, няведама.

Стыдна аб такіх рэчах пісаць, але яшчэ горш прыкра, што такія праявы здараюцца. Трэба нам для моладзі сваіх арганізацыяў беларускіх, бо ў чужых арганізацыях дзе ідэолёгія не прагаварвае да сэрца беларускага, моладзь наша зьдзічэе.

Перапісь насельніцтва ў нас адбылася 9 сьнежня 1931 г. Людзей перапісывалі польскія вучыцялі і польскія асаднікі. Усе людзі гаварылі, што іх мова бацькаўская беларуская, але камісары запісывалі як хацелі. Нашы і шляхтуны казалі, што іх бацькаўская мова беларуская. Як камісары запісалі нашым людзям бацькаўскую мову—можна лёгка дагадацца, але людзі дык усе заяўлялі, што іх бацькаўская мова беларуская.

Падарожны.

ПАГРОЗА ГОЛАДУ.

Скірдзімы, Ашмянскага пав. Насельніцтва нашых ваколіц у прошлае лета пацярпела ад градабіцьця. Збожжа амаль усё асталося на полі зьмяшана з зямлёй. Адно толькі, бульбу ўдалося з зямлі выбраць. Цяпер сяляне жывяцца амаль адной бульбай. Хлеб вельмі рэдкім гасьцём бывае на сялянскім стале. Многім не хапіла жыта і на пасеў. Заработкаў няма ніякіх, пазычыць няма дзе, а казённай пазычкі дастаць трудна. Увосень нашы вяскоўцы падавалі просьбу ў старацтва аб запамозе, але гэтай запамогі ў форме пазычкі вельмі мала хто дастаў і то па 20—30 злотых. Сяляне, дзе хто мог, апазычыліся па вушы. Цяпер гэны доўг націскае, а аддаць няма з чаго. Ужо некаторым назначаны ліцытацыі маемасьці за даўгі. Апрача гэтага, сэквэстратары не даюць спакою пануківаньнем, каб плацілі падаткі, забіраючы кажухі і іншыя рэчы. Прадаць няма чаго. Прадаў-бы селянін і апошнюю кароўку, або сьвінчанё, каб адчапіцца ад сэквэстратара, або даўжніка, але-ж скаціна і ўсё сялянскае дабро йдзе за бясцэн.

Нашы сяляне цяпер ня могуць ніяк выкапацца ад даўгоў і падаткаў, а аб жыцьці дык і думаць забыліся. Калі хто захварэе, дык ніхто і ня думае, што трэба лячыцца, бо няма за што. Кожны толькі заглядае ў пограб, мераючы вокам, ці хопіць да вясны бульбы. Што будзе вясной, ніхто ня цікавіцца. Адны толькі сяляне маюць пажаданьне— дай Божа дачакаць цяпла і травы!...

Гаспадар.

З краю.

На вясельлі патруліся дзераўляным сьпірытусам. У в. Галінцы, Казлавіцкай гм. падчас вясельля затрулася 15 асоб вясельнікаў дзераўляным сьпірытусам. Затрутых вясельнікаў адвезьлі ў шпіталь.

Рэдактар Ян Пазьняк.

Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня.

Выдавец А. Шутовіч.